Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Даўгінаўская сярэдняя школа

імя У.І.Слабодчыкава ”

# Карэкцыйныя заняткі
# ў 3 класе

(па праграме 4 класа спецыяльнай
агульнаадукацыйнай школы для вучняў з цяжкасцямі
ў навучанні)

## Тэма. Развіццё мыслення (устанаўленне заканамернасцей) на прыкладзе заданняў «Фігура, якой не хапае», і «Адгадай лік»

Настаўнік-дэфектолаг

Н.А. Цімашчук

## Карэкцыйныя занятк і ў 3 класе

(па праграме 4 класа спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы для дзяцей з парушэннямі псіхічнага развіцця (цяжкасцямі ў навучанні))

**Тэма. Развіццё мыслення (устанаўленне заканамернасцей) на прыкладзе заданняў «Фігура, якой не хапае», і «Адгадай лік».**

**Задачы:**

Ствараць умовы для развіцця мыслення (устанаўленне заканамернасцей) на прыкладзе заданняў «Фігура, якой не хапае», і «Адгадай лік».

Садзейнічаць развіццю

- ✓ прасторавых уяўленняў мыслення;
- ✓ творчага мыслення (параўнання, разумовага заключэння);
- ✓ лагічных аперацый мыслення (аналіз, сінтэз);
- ✓ хуткасці мыслення.

Выхоўваць старанныя адносіны да выканання заданняў і жаданне працаваць самастойна.

**І Арганізацыйны пачатак занятку. Псіхалагічны настрой**

1. Арганізацыйны момант.
   Знаёмства з тэмай і задачамі занятку.
2. Псіхалагічная хвілінка.

– Дыхай роўна, расслаб плечы, нахілі галаву наперад, пакруці галавой з боку на бок, падбародкам «вычарці» паўкруг на грудзях.

– Створым адзін аднаму добры настрой. Усміхнёмся, пажадаем поспехаў.

**ІІ Работа па тэме занятку.**

**--- Заданне 1 «Фігура, якой не хапае»** (развіццё мыслення (устанаўленне заканамернасцяў)











--- **Заданне 2 «Знайдзі квадрат, якога не хапае»** (развіццё прасторавых уяўленняў)



**?**

**---Заданне 3 «Знайдзі пару»** (развіццё творчага мыслення (параўнанне)).

Упісаць літары ў такія ж фігуры ў ніжнім радзе. Прачытаць слова. (*Мысленне)*

*Заданні для прапанавання:*




**--- «Гульня са словамі»**

Расстаў літары па парадку ў адпаведнасці з лічбамі. Напішы словы, якія ў цябе атрымаліся.

**Ф А Е Ь Т Р П Л Ч А К У Р Ш С А Ы К Т**
**5 2 6 8 4 3 1 7 3 5 4 2 1 2 1 5 3 6 4**

**---Заданне 4 «Зашыфруй інфармацыю»** (развіццё лагічных аперацый мыслення (аналіз, сінтэз)

Прапаноўваецца для ўсяго рускага або беларускага алфавіта, з дапамогай якога школьнік зашыфроўвае сваё пасланне, якое адрасавана настаўніку-дэфектолагу. У сваю чаргу настаўнік таксама рыхтуе пасланне для вучня. Такім чынам, вучань мае магчымасць пачытаць пасланне, настаўнік-дэфектолаг тут жа праверыць і дапамагчы выправіць памылкі.

***Ключ русского алфавита:***

**А Б В Г Д Е Ё Ж З И Й К Л М Н О П**
**1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 13 14 15 16 17**

**Р С Т У Ф Х Ц Ч Ш Щ Ъ Ы Ь Э Ю Я**
**18 19 20 21 22 23 24 25 26 27 28 29 30 31 32 33**

***Ключ беларускага алфавіта:***

**А Б В Г Д Дз Дж Е Ё Ж З І Й К Л М Н О П**
**1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12 13 14 15 16 17 18 19**

**Р С Т У Ў Ф Х Ц Ч Ш Ы Ь Э Ю Я**

**20 21 22 23 24 25 26 27 28 29 30 31 32 33 34**

**Фізкультхвілінка «Матылькі»**

Раніцою матылёк прачнуўся
Пацягнуўся, усміхнуўся
На адзін – расой памыўся.
На два – лёгка пакруціўся.
Тры – нахіліўся і прысеў.
На чатыры – паляцеў.

**--- Гульня «Заканчэнне слоў»** (развіццё хуткасці мыслення)

Вымаўляецца першы склад слова, а вучань яго заканчвае.

*По…; на…; за…; мі…; му…; до…; ча…; кры…; ку…; ру… .*

*(Поле, нага, завея, міска, мука, дошка, чапля, крыло, курыца, рука)*

**--- Заданне 5 «Падабенства і адрозненне»** (развіццё лагічнага мыслення (параўнанне, разумовага заключэння)

Прапаноўваюцца па два прадметы або паняцці. Кожны вучань павінен напісаць якасці падабенства – злева, а справа – якасці адрознення названых прадметаў, паняццяў.

***Словы для выкарыстання:***

*Шкло – лёд, снег – вата, рука – нага, радыё – тэлевізар, чалавек – малпа, гвозд – шуруп, сані – калёсы.*

**Зрокавая гімнастыка**

*Вочкамі малюем спіралькі, спачатку зверху ўніз, а затым знізу ўверх.*

*Зажмурым вочкі, прыціснем далонькамі, каб не было доступу святла напрацягу 10 секунд, а затым адкрыем і хуценька памаргаем. А зараз спакойненька закрыем вочкі на 10 секун, адкрыем іх і прадоўжым працаваць.*

**--- Заданне 6 «Пераўтварэнне адной фігуры ў другую»**

На стале набор лічыльных палачак. Настаўнік-дэфектолаг паказвае графічныя задачы. Вучні іх выкладваюць з палачак.

**--- Заданне 7 «Займальныя заданні»**



**2.** Сярожа ішоў па лесвіцы. Ён крочыў праз дзве прыступкі і лічыў: «Адзін, два, тры, чатыры…» Калі яму трэба было сказать пяць, то аказалася, што засталася  адна прыступка. Колькі ўсяго прыступак на лесвіцы? (14)

**3.** Лесвіца складаецца з 15 прыступак. На якую прыступку трэба стаць, каб аказацца на сярэдзіне лесвіцы?

**4.** Вова і Дзіма рашылі па задачы за 10 мінут. Колькі часу затраціў на рашэнне задач кожны хлопчык?

**5.** На дрэве сядзелі тры птушкі. Да іх прылятелі яшчэ дзве птушкі. Кот падкраўся і схапіў адну птушку. Колькі птушак засталося сядзець на дрэве?

**6.** Мама купіла адзін кілаграм бананаў, два кілаграмы апельсінаў, адзін кілаграмм памідораў і  тры кілаграмы персікаў? Колькі кілаграмаў фруктаў купіла мама?

**7.** У мамы дзве дачкі і адзін сын. Адной дачцы – піражок, другой – таксама піражок. А для сыночка? Забылася. Няхай кожная сястрычка дасць братіку палавінку. Так і зрабілі. Хто атрымаў больш?

**III Рефлексія занятку**

1. Што мы развівалі на занятку?
2. Што табе на занятку найбольш спадабалася?
3. Што не спадабалася?
4. Якія цяжкасці ў цябе былі? Як ты думаеш чаму?
5. Дай славесную ацэнку сваей дзейнасці.





| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | |
| | | | | | | | |